# АНАТОЛЬ ВАСІЛЬЕВІЧ ШАРКОЎ – НЕЗАМЕННЫ ЎДЗЕЛЬНІК КАНФЕРЭНЦЫІ «БЕЛАРУСЬ І ГЕРМАНІЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ»

Распачаць свае ўспаміны пра Анатоля Васільевіча Шаркова мне хацелася б з аднаго вельмі важнага для нас абодвух гістарычнага факта – нашага зямляцтва. Ён нарадзіўся праз тры гады пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны на нашай любай малой Радзіме – на вызваленай і часткова адбудаванай Крупшчыне, у гарадскім пасёлку Халопенічы, што знаходзіцца на поўначы Крупскага раёна Мінскай вобласці. Жыццёвы досвед будучага ваеннага гісторыка паказвае і пры гэтым абгрунтавана пераконвае, што сапраўдныя вытокі сваіх творчых захапленняў і навуковага натхнення, а таксама духоўнай моцы часам неабходна шукаць не толькі ў студэнцкай аўдыторыі ці за кніжным сталом, а значна глыбей. У той бацькоўскай хаце, сямейным радаводзе і на прасторах малой Радзімы, якія даюць нам старт у жыццё, пачынаюць фарміраваць будучую асобу, прывіваючы пачуцці любові, адказнасці, памяці.

Другі важны момант нашых зямляцкіх адносін заключаўся ў тым, што імя савецкага біятланіста Анатоля Шаркова мне было добра вядома яшчэ ў студэнцкія часы, калі самому цягам трох гадоў навучання ў інстытуце даводзілася актыўна займацца падрыхтоўкай да лыжных спаборніцтваў па біятлоне. На трэніроўках час ад часу згадвалася прозвішча беларускага майстра спорту СССР – Шаркова, якога ў канцы 1960-х і ў 1970-я гады добра ведалі не толькі на біятлонных трасах у Раўбічах, але і далёка за межамі Беларусі. Нам з ім не давялося сустрэцца на снежнай лыжні спаборніцтваў, але ўспаміны пра наша агульнае спартыўнае захапленне, трэніровачныя зборы, сакрэты падрыхтоўкі інвентару, перш за ўсё выбару лыжнай змазкі і методыкі стралковай падрыхтоўкі, не кажучы пра самі гонкі з бегам класічнай мужчынскай дваццаткі з 4 стралковымі рубяжамі, тактыкай праходжання сваіх эстафетных этапаў на лагойскай і іншых трасах у час розных спаборніцтваў і шмат чаго іншага, не пакідалі нас практычны ніколі. Асабліва актыўна мы з ім абмяркоўвалі вынікі правядзення чарговага этапу штогадовых міжнародных спаборніцтваў у рамках Кубка свету па біятлоне. А калі праходзілі зімовыя Алімпіяды, то гэта тэма з перадачай непаўторнай атмасферы барацьбы на біятлонных трасах і заўзятарскага перажывання за сваіх любімых спартсменаў станавіліся для нас абодвух галоўнай тэмай не толькі нашых размоў, але і гарачых дыскусій: пытанні камплектавання каманд, тактыка барацьбы на лыжнай трасе, урокі вытрымкі на стралковым рубяжы, трапнасць стральбы біятланістаў па мішэнях на кожным з праведзеных этапаў і г.д. практычна заўсёды знаходзіліся ў фокусе нашых цікавых размоў з вядучым ваенным гісторыкам, доктарам гістарычных навук, прафесарам А. В. Шарковым.

Нагадаю, што крыху больш чым праз 25 гадоў пасля свайго біятлоннага ўзыходжання да вяршыню майстра спорту ён здабывае высокую навуковую ступень доктара гістарычных навук. Аб паспяховай абароне малавядомай тэмы дысертацыі «Утрыманне і працоўнае выкарыстанне ваеннапалонных і інтэрніраваных на тэрыторыі Беларусі ў сістэме органаў унутраных спраў

(1944–1951 гг.)» мне пад вялікім уражаннем распавядаў былы загадчык кафедры гісторыі КПСС МДПІЗМ, а з пачатку 1990-х гадоў – сябра савета па абароне доктарскіх дысертацый у БДУ прафесар У. К. Коршук. Роўна праз 4 гады пасля гэтай даты пачалося наша прафесійнае супрацоўніцтва. Успамінаю сваё хваляванне, калі пасля правядзення ў МДЛУ ў канцы мая 2002 г. першай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць» узнікла патрэба ў правядзенні знешняй экспертызы навуковых матэрыялаў, падрыхтаваных для выдання ў якасці матэрыялаў удзельнікаў канферэнцыі. На той час адзін з сяброў рэдакцыйнай калегіі доктар гістарычных навук У. К. Коршук даў параду звярнуцца да маладога прафесара, які літаральна год назад атрымаў гэта вучонае званне, – А. В. Шаркова. Тады ён займаў пасаду начальніка кафедры крымінальна-выканаўчага права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь.

Сустрэча распачалася з агульнага знаёмства, якое адразу зблізіла нас, пра што ішла размова вышэй. У навуковым плане ў рэцэнзента адразу ж узнік інтарэс да тэматыкі канферэнцыі ў МДЛУ. Яго, як ваеннага гісторыка, хто пад навуковым кіраўніцтвам прафесара А. М. Мацко падрыхтаваў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Дзейнасць органаў унутраных спраў у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945)», вельмі цікавіла ваенная праблематыка, якая з першай канферэнцыі ўсё больш вызначалася ў якасці прыярытэтнага напрамку дзейнасці шматлікіх удзельнікаў канферэнцыі. Таму не было выпадковым адназначнае рашэнне рэцэнзента падтрымаць ініцыятыву кафедры гісторыі і беларусазнаўства Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта аб выданні матэрыялаў зборніка першай канферэнцыі, прысвечанай 10-й гадавіне аднаўлення адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Федэратыўнай Рэспублікай Германія.

Нагадаем, што сярод задач, якія з першай сустрэчы імкнуліся вырашаць удзельнікі канферэнцыі, вылучаўся пошук адэкватных падыходаў, скіраваных на ўсебаковае даследаванне вузлавых праблем гістарычнага мінулага і сучаснасці: перыяду Другой сусветнай вайны і новага этапу супрацоўніцтва Беларусі і Германіі пасля аднаўлення поўнавартасных і шматгранных кантактаў у пачатку 1990-х гадоў. Менавіта тады прагучаў зварот рэдакцыйнай калегіі першага выпуска да ўдзельнікаў канферэнцыі, каб з моманту яе правядзення была закладзена трывалая традыцыя па рэгулярных вясновых сустрэчах гісторыкаў у МДЛУ. Гэту ідэю асабліва вітаў паважаны рэцэнзент і пажадаў поспехаў новаму навуковаму праекту ў наданні яму міжнароднага фармату. Дзякуючы слушнай парадзе рэцэнзента наступныя сустрэчы мелі статус «Міжнароднай навуковай канферэнцыі», паколькі ў ёй прымалі ўдзел даследчыкі з розных краін свету, у тым ліку Беларусі, Аўстрыі, Германіі, Вялікабрытаніі, ЗША, Канады, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны.

Так быў зроблены першы крок на нашым 18-гадовым сумесным прафесійным шляху. З моманту першай сустрэчы ў чэрвені 2002 г. мы адразу адчулі патрэбу ў больш блізкіх сяброўскіх адносінах, асабліва пасля таго, як не толькі знайшлі агульныя факты ў сваіх спартыўных біяграфіях, упісаных у

нашу памяць шматкіламетровымі прабежкамі па заснежанай, марознай, іскрыстай лыжні ў Раўбічах і Лагойску, але і высветлелі пытанне нашага агульнага зямляцтва. Пасля гэтага доктар гістарычных навук прафесар Шаркоў А. В. тройчы выступаў у ролі рэцэнзента зборніка матэрыялаў навуковай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць». А з 2005 г. сам становіцца актыўным удзельнікам сустрэч у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце.

Тая роля, якую пачаў адыгрываць А. В. Шаркоў як непасрэдны ўдзельнік вясновых навуковых канферэнцый, сведчыць, хутчэй за ўсё, аб яго незаменнасці: як сябра рэдакцыйнай рады, апантанага выступоўцы, вядучага пленарных пасяджэнняў і аўтара прэзентацый новых выданняў, у тым ліку манаграфій і навуковых выданняў, востры апанент, гарачы дыскутант і заўзятар размоў на розныя тэмы за часам кава-паўзы – гэта малая крыха таго, што сёння хочацца вылучаць у дачыненні да добра вядомага ў свеце даследчыка беларускай ваеннай і пасляваеннай гісторыі.

Галоўная тэматыка яго выступленняў зводзілася да наступнага: «Генералы вермахта і карных органаў нацысцкай Германіі ў палоне», «“Вестарбайтары” на будоўлях Беларусі 1945–1951 гг.», «Аператыўная работа ў лагерах ваеннапалонных на тэрыторыі Беларусі 1944–1951 гг.», «Мерапрыемствы па прыёму тых савецкіх грамадзян, хто вяртаўся на Радзіму з тэрыторыі дзяржаў Заходняй Еўропы (1944–1946)», «Судовы пераслед арганізатараў, кіраўнікоў і удзельнікаў Арміі Краёвай, затрыманых у заходніх раёнах Беларусі ў 1944–1945 гг.», «Міласэрнасць да адоленага праціўніка», «Карная палітыка дзяржавы ў адносінах асоб, якія супрацоўнічалі з нацысцкім рэжымам у гады Вялікай Айчыннай вайны», «Замак гродзенскай турмы ў карнай сістэме Расійскай імперыі». Не без яго бацькоўскай падтрымкі на канферэнцыях двойчы прагучалі выступленні дачкі Алены.

Надоўга заставаўся ў аўдыторыі, дзе ладзіліся пленарныя пасяджэнні з удзелам беларускіх і замежных даследчыкаў, арганізацыйны дух мадэратара А. В. Шаркова. Ён умеў трапна прадставіць кожнага ўдзельніка, знайсці для яго асабліва важныя словы падтрымкі і падказаць пачынаючаму гісторыку напрамак далейшага пошуку, або прапанаваць сваю падтрымку ў форме магчымага апаніравання дысертацыі. Акадэмічны стыль гісторыка адзначалі адразу ж на перапынку ці падчас правядзення кава-паўзы, пры гэтым адзначалі прыязнае стаўленне прафесійнага гісторыка да моладзі, аспірантаў і саіскальнікаў. Часам вельмі здзіўляліся, каб нечакана для сябе даведваліся, што побач з імі стаіць сапраўдны палкоўнік беларускай міліцыі.

У той жа час афіцыйная роля мадэратара дазваляла А. В. Шаркову задаваць асобным выступоўцам, асабліва замежным, прынцыповыя пытанні. Часам іх пастаноўка пераўтварала аўдыторыю ў гладыятарскую сцэну, на якой сыходзіліся навукоўцы з процілеглымі поглядамі на праблему ці рознымі падыходамі ў іх навуковым даследаванні. Акадэмізм дыскусій не дазваляў

пераходзіць пэўныя межы, аднак напружанне абмеркавання перадавалася аўдыторыі, уключала яе удзельнікаў у процістаянне па пытаннях, што тычыліся ідэалогіі, прыводзіла да пошуку шляхоў усталявання навуковага кампрамісу ці выхаду з сітуацыі. Пры гэтым, вобразна кажучы, навуковец, бывала, у такія моманты як бы апранаў традыцыйны для сябе мундзір вайсковага палкоўніка, якому патрэбна было трымаць абарону любымі сродкамі і не здаць праціўніку. Аднак у такіх умовах бачылася спартыўная зацятасць дыскутанта, праяўляўся яго баявы дух вядзення да перамогі сваёй барацьбы, дасягненне перамогі любымі сродкамі, у тым ліку не заўсёды прымальнымі ў навуковых колах. Удзел у такіх дыскусіях адбываўся па прынцыпова важных пытаннях сучаснай гістарычнай навукі, у якой і сёння сустракаюцца ідэалагічныя стэрэатыпы савецкага часу. Цяперашні час патрабуе рашуча адмовіцца ад іх, аднак не заўсёды гэта атрымліваецца.

Асабліва яркімі фарбамі А. В. Шаркоў мог намаляваць сваё чарговае выступленне, калі прыходзіў у Цэнтр беларускай мовы і літаратуры з падарункамі, у якасці якіх даволі часта выступалі яго новыя кнігі. Так, сярод аўтарскіх дарункаў Цэнтру і бібліятэцы МДЛУ можна назваць наступныя: А. В. Шарков. Архипелаг ГУПВИ : военнопленные и интернированные на территории Беларуси: 1944–1945 гг. – Минск : Тесей, 2003. – 168 с.; А. В. Шарков, В. В. Грозов, Ю. А. Бествицкий. Под крестом судьбы – Минск : Белорус. Правосл. Церковь, 2011. – 431 с.; А. В. Шарков, В. Д. Селеменев. Воинские захоронения Первой мировой войны в Беларуси = Soldatengraeberanlagen aus dem Ersten Weltkrieg in Belarus – Минск : НАРБ, 2010. – 187 с.; А. В. Шарков. Ссылка, высылка, депортация: принудительные миграции населения Белорусской ССР – Минск : Акад. МВД Респ. Беларусь, 2014. – 194 с.; А. В. Шарков, Е. И. Хорошевич. Жить и помнить : советские воинские захоронения в Европе. Кн. 1. – Минск : Звязда, 2015. – 368 с.; Последний приют солдата [Комплект] = Letzte Ruhestaette fuer die Soldaten / А. В. Шарков [и др.] ; пер. на нем. яз. Е. И. Хорошевич. – Минск : Звязда, 2014. – 208 с.; Е. И. Хорошевич, А. В. Шарков. Обелиски памяти Русской Императорской армии Первой мировой войны – Минск : Белпринт, 2018. – 328 с.; А. В. Шарков, Е. И. Хорошевич. Ставка Верховного главнокомандующего Русской армией в годы Первой мировой войны в событиях и лицах – Минск : Звязда, 2017. – 256 с. Большасць з гэтых кніг маюць уласнаручны подпіс аўтара, які пакідаў свае кнігі ў якасці дакунка бібліятэцы ці Цэнтру беларускай мовы і культуры МДЛУ.

Спецыяльна адзначым, што ўдзельнікі чарговай канферэнцыі ў 2016 г. з вялікай радасцю ўспрынялі навіну аб тым, што па выніках 2015 г. прафесар кафедры крымінальна-выканаўчага права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь А. В. Шаркоў і пазаштатны супрацоўнік галоўнай дырэкцыі міжнароднага вяшчання Беларускага радыё А. І. Харашэвіч за стварэнне кнігі-рэквіема

«Жить и помнить», у якой абагульнены вынікі работы па вызначэнні і вывучэнні месцаў пахаванняў беларусаў – абаронцаў Айчыны ў розных куточках Еўропы – сталі лаўрэатамі прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».

Апошні матэрыял на тэму «Трагедыя вёскі Ола», з якой А. В. Шаркоў выступаў у мінулым годзе на канферэнцыі 5 красавіка 2019 г., выйшаў у чарговым зборніку тады, калі не стала паважанага гісторыка. Ён быў падрыхтаваны разам з сябрам саюза пісьменнікаў Беларусі шматгадовым сааўтарам А. І. Харашэвіч. На чарговай канферэнцыі, запланаванай на 3 красавіка бягучага года, гісторык планаваў выступаць з тэмай «Польскія ваеннапалонныя ў БССР». Аднак гэты не адбылося ў сувязі з тым, што 20 студзеня 2020 г. перастала біцца сэрца паважанага прафесара, доктара гістарычных навук Анатоля Іванавіча Шаркова. Светлая памяць пра яго назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

У якасці выніковага падсумавання хочацца адзначыць, што, Крупская зямля, багатая сваімі знакамітымі людзьмі і гістарычнымі традыцыямі, безумоўна, паўплывала значна на станаўленне характару і выбар жыццёвага шляху Анатолем Васільевічам. Як зямляк, ганаруся нашым даўнім і працяглым сяброўствам з гэтым прафесіянальным гісторыкам і незаменным чалавекам. Глыбока ўпэўнены, што ў землякоў як з Халопеніч, так і з Крупшчыны ёсць усе падставы ганарыцца такім земляком, як Анатоль Васільевіч Шаркоў.

*Сяргей Яўгенавіч Новікаў,*
*кандыдат гістарычных навук*